«Краязнаўчая газета»: 700 нумароў за 15 гадоў



# Шаноўныя сябры і калегі!

Вельмі рады звярнуцца да вас з нагоды выхаду ў свет 700-га нумару «Краязнаўчай газеты» і 15-годдзя выдання. Лічу, што на сённяшні дзень «Краязнаўчая газета» з'яўляецца амаль што адзіным інфармацыйным рэсурсам у галіне краязнаўства. Унікальныя сведчанні аб дзеячах беларускай гісторыі, культуры і навукі, рэдкія фотаздымкі, меркаванні аўтарытэтных даследчыкаў па актуальных пытаннях, анонсы значных падзеяў у культурным жыцці краіны, творчыя справаздачы аб правядзенні яскравых імпрэзаў беларускімі музеямі, галерэямі, тэатрамі, установамі адукацыі... І гэта ўсё ў адным выданні! Сам факт існавання на працягу 15 гадоў газеты грамадскага аб'яднання, што трымаецца на ініцыятыве неабыякавых асобаў, – ужо перамога і ўнікальная з'ява. Вакол выдання аб'яднаныя выдатныя гісторыкі, культуролагі, мастацтвазнаўцы, настаўнікі. Разам з газетай «Культура» і часопісам «Мастацтва» наша газета была і застаецца вядучым выданнем у галіне культуры Беларусі. Асабіста я маю вялікі архіў артыкулаў «КГ» пачынаючы з 2010 года з рознымі ўмоўнымі пазнакамі: гэтыя матэрыялы неаднаразова выкарыстоўваліся ў выкладчыцкай і навуковый дзейнасці, а таксама пры падрыхтоўцы канцэпцыяў шэрагу культурна-асветніцкіх праграмаў, што рэалізуюцца Мінскім абласным аддзяленнем Беларускага фонду культуры, мастацкай галерэяй «Універсітэт культуры» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, Цэнтрам міжкультурнага дыялогу і сацыяльных ініцыятываў Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва.

Шчыра жадаю супрацоўнікам рэдакцыі, аўтарам і чытачам «Краязнаўчай газеты» здароўя, плёну, натхнення, апантанасці і задавальнення ад працы.

**З павагай,**
**Павел САПОЦЬКА**



Хочам падзякаваць НАШАЙ і ВАШАЙ «Краязнаўчай газеце» за тое, што вы ёсць і столькі шмат робіце для жыхароў і гасцей нашай краіны. Заўсёды з цікавасцю чытаем выданне, даведваемся новае пра нашую гісторыю і традыцыі. Віншуем з 700-м нумарам, з 15-годдзем!

**З павагаю,**
**Ірына і Міхаіл МАКЕІ,**
**гаспадары аграсядзібы «Верас»,**
**Зэльвенскі раён**

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУ